УДК 811.161.3'27:378.6

# Некаторыя сацыялінгвістычныя тэндэнцыі ў негуманітарнай сферы адукацыі (на матэрыяле анкетавання студэнтаў БНТУ)

Будзько І.У., Пятрова Н.Я., Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

На працягу 2011 – 2012 гг. сярод студэнтаў БНТУ было праведзена сацыялінгвістычнае анкетаванне з мэтай вызначыць, якую мову ўсведамляюць рэспандэнты як родную, у якіх сферах і наколькі часта выкарыстоўваюць яны беларускую і рускую мовы. Пры апрацоўцы атрыманых дадзеных былі вылучаны наступныя крытэрыі, якія ўплывалі на змест адказаў на пытанні: а) факультэт, на якім навучаецца рэспандэнт; б) пол; в) нацыянальнасць; г) веравызнанне; д) месца нараджэння; е) адукацыя бацькоў.

Па выніках анкетавання можна адзначыць наступнае:

- найбольш поўна сітуацыю дзяржаўнага білінгвізму адлюстравалі студэнты ваенна-тэхнічнага факультэта (42,3% студэнтаў гэтага факультэта назвалі беларускую мову як родную); студэнты ФІТРа ў мінімальнай ступені адлюстравалі прысутнасць беларускай мовы ва ўласнай аксіялагічнай сістэме (22,5%);
- на вызначэнне спецыфікі выкарыстання дзвюх дзяржаўных моў у жыцці рэспандэнтаў уплывае гендарны фактар: студэнты жаночага полу радзей выкарыстоўваюць беларускую мову ў якасці сродку зносін, чым рэспандэнты мужчынскага полу (адпаведна 68,1% і 52,3%);
- уплыў фактара веравызнання (рэспандэнты-каталікі большасцю называюць у якасці роднай мовы беларускую, у той час рэспандэнты-атэісты ў якасці роднай мовы называюць рускую – 55% апытаных);
- фактар нацыянальнай прыналежнасці нязначна ўплывае на вызначэнне роднай мовы: большасць рэспандэнтаў-беларусаў у якасці роднай мовы назвалі ці толькі беларускую мову, ці адначасова рускую і беларускую мовы (амаль 71%), рэспандэнты-палякі часцей называлі роднай мовай беларускую або беларускую і польску мовы (57%);
- атрыманая бацькамі рэспандэнтаў адукацыя не паўплывала на вынікі;
- месца нараджэння: рэспандэнты-вяскоўцы часцей называюць беларускую мову ў якасці роднай і актыўней выкарыстоўваюць яе ў якасці сродку зносін.

Такім чынам, прыведзеныя дадзеныя выяўляюць характэрныя для студэнтаў негуманітарнай сферы навучання сацыялінгвістычныя тэндэнцыі і адлюстроўваюць неабходнасць папулярызацыі сярод моладзі Беларусі беларускай мовы як абавязковага кампанента нацыянальнай вышэйшай адукацыі краіны.